# Найлепшы падарунак



Фота Кастуся Дробава.

*Берасцейская (Радзівілаўская) Біблія, 1563 г.*

Галоўны экспанат, прадстаўлены на выстаўцы «Той самы падарунак да 1000-годдзя», якая нядаўна прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, — унікальны асобнік Берасцейскай Бібліі, набыты і падараваны Брэсту на яго тысячагоддзе. Адбылося гэта ў 2019-м — у гадавіну згадкі ў летапісе пра старажытны горад.

На вялікай сцэне падчас віншаванняў Кіраўнік дзяржавы перадаў у дар добра захаваны асобнік кнігі. Выданне гэтае сімвалічнае і для сучаснага Брэста, і для ўсёй Беларусі — унікальная, фенаменальная з'ява, якая праславіла краіну ў час свайго ўзнікнення ў XVI стагоддзі і дагэтуль застаецца сімвалам-помнікам эпохі і сведчаннем высокага развіцця культуры таго перыяду. Гэта самы прыгожы і багаты кніжны помнік, які быў створаны на беларускіх землях ад пачатку кнігадрукавання і да XIX стагоддзя.

А выпусціла выданне ў свет першая друкарня, якая паўстала на тэрыторыі сучаснай Беларусі (ранейшыя, заснаваныя Францыскам Скарынам, сёння знаходзяцца на тэрыторыі іншай краіны). Біблію гэтую называюць Радзівілаўскай, бо яна з'яўляецца самым яркім помнікам дзейнасці Мікалая Радзівіла Чорнага, у свой час самага багатага і ўплывовага дзеяча Беларусі.

**Працяг на стар. 2** ►

# Найлепшы падарунак

Кніга стала першым перакладам з арыгінальных моў на жывыя мовы таго часу ва Усходняй Еўропе — яна паслужыла асновай і прататыпам для далейшых пошукаў і біблейскіх праектаў, у тым ліку для Астрожскай Бібліі.

У выданні фаліянтнага фармату шмат цудоўна выкананых гравюр, больш ад паўтары тысячы старонак. Кніга ўражвае. Але 50 гадоў таму ў Беларусі не заставалася ніводнага яе асобніка…

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

— Дзякуючы пэўным намаганням і спонсарскай падтрымцы атрымалася зрабіць магчымым вяртанне асобніка Берасцейскай Бібліі, яшчэ нядаўна такая мара ўспрымалася як фантазія. Але дзякуючы імпэту некаторых людзей яна стала рэальнасцю, — дзяліўся падчас экскурсіі намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша.

Сёння Берасцейская Біблія шырока ўвайшла ў культурную прастору і стала сімвалам ушанавання і гонару за дасягненні папярэднікаў. Пасля атрымання кніга была перададзена ў Музей гісторыі горада Брэста. Адмыслова для яе захоўвання выканалі вітрыну з тэмпературным рэжымам, мікракліматам. Было зроблена навуковае апісанне кнігі, алічбаванне, ёсць дамоўленасць аб правядзенні рэстаўрацыйных работ.

**Марыя ЯРАШЭВІЧ**